# Прыемнага ПАЛЁТУ

Творчасць Яны Сурмачэўскай знаходзіць сваё адлюстраванне і на паштовых канвертах і марках. Напрыклад, дзяўчына стала аўтарам канверта «Маладзечна — культурная сталіца Беларусі-2016», паштовай маркі «150 гадоў з дня нараджэння Льва Бакста».



У Прыродна-экалагічным музеі дзейнічае **персанальная выстава «Выпрастай крылы»** мастачкі з Мінска, дызайнера, выкладчыка акадэмічнага мастацтва Яны Сурмачэўскай.







На адкрыцці выставы прысутнічалі студэнты валанцёрскага цэнтра Полацкага дзяржуніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай. Яны далучыліся да падзеі ў рамках экалагічнага праекта «Зялёны шлях» пад кіраўніцтвам Маргарыты Янкоўскай.

У экспазіцыі прадстаўлена больш за 30 карцін, прысвечаных птушкам Беларусі. Ідэя стварыць такі цыкл з'явілася ў 2019 годзе:

— *Гэта быў час, калі я праходзіла асабістую трансфармацыю, вырашыла кардынальна памяняць жыццё, адпаведна змяніўся і ўнутраны свет. З дзяцінства мяне зачароўвалі птушкі, я заўсёды хацела мець крылы за спіной і навучыцца лётаць,* — прызналася дзяўчына.

«Выпрастаць крылы» ў аўтара атрымалася дзякуючы мастацтву. Першая напісаная ёй карціна мела назву «Вялікая сініца». Любоў мастачкі да птушак настолькі моцная, што яе працы ўражваюць сваёй рэалістычнасцю. Кожная з іх — гэта маленькі аповед пра жыццё птушак, іх звычкі і характары. Работы выкананы ў тэхніцы акварэльнага жывапісу. Лёгкія мазкі ствараюць эфект бязважкасці і празрыстасці, нібы птушкі раствараюцца ў паветры. Майстэрскае валоданне тэхнікай дазваляе мастачцы перадаць драбнюткія дэталі апярэння і стварыць адчуванне жывой прысутнасці. Яна часта звяртаецца да фатаграфій бёрдвочараў, аддаючы перавагу здымкам з Беларусі. Гэта звязана з неабходнасцю спалучаць мастацкую каштоўнасць з дакладным захаваннем арніталагічных характарыстык.

У калекцыі мастачкі 70 карцін з птушкамі, у яе планах адлюстраваць усе віды птушак, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, а іх — 344.

Маляванне птушак у натуральным асяроддзі ўскладняецца іх нежаданнем доўга заставацца на месцы, што робіць іх «мадэлямі» на лічаныя хвіліны. Таксама Яну натхняюць працы Мікалая Селешчука, Хонга Сунга, Нікаласа Лопэса, Карла Мартэнса.

Выстава «Выпрастай крылы» — гэта заклік да беражлівых адносін да прыроды, захавання яе прыгажосці і разнастайнасці. Гэта напамін пра тое, што мы ўсе — частка гэтага свету і павінны клапаціцца пра яго. Яна Сурмачэўская спадзяецца, што яе творчасць дапаможа аматарам лепш разгледзець птушак і, магчыма, пазнаць у адной з іх свой татэмны сімвал.

Выстава будзе экспанавацца **да 16 студзеня 2026 года.**

**Надзея КАЛУЖОНАК**
**(тэкст і фота).**